Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЖНІЎНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 151 (28009) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Гісторыя адной сям'і

СТАР. 5

Як ідзе будоўля АЭС

СТАР. 7

Дэмаграфічныя зрухі

СТАР. 10

ЛІЧБА ДНЯ

На 16,3%

павялічыўся ў студзені-чэрвені 2015 года ў параўнанні з адпаведным перыядам 2014-га сярэднямесячны памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і склаў Br2 млн 417,9 тысячы. Так, з 1 мая па 31 ліпеня гэтага года памер дапамогі пры нараджэнні першага дзіцяці склаў Br2 млн 261,2 тысячы; пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — Br2 млн 584,3 тысячы; на дзіця-інваліда — Br2 млн 907,3 тысячы. Пераразлік памераў дзяржаўнай дапамогі адбываўся з 1 лютага — у сувязі з павелічэннем бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ) і з ростам сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у рэспубліцы; з 1 мая — у сувязі з павелічэннем БПМ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.08.2015 г.

Долар ЗША	15805,00	▲
Еўра	17327,00	▲
Рас. руб.	245,50	▼
Укр. грыўня	748,61	▲

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15151



Фота БЕЛТА.

ЗА СЛОВАМ — СПРАВЫ

Учора пачаўся трохдзённы візіт у нашу краіну прэм'ер-міністра Пакістана Навяза Шарыфа

Высокага госця ў аэрапорце асабіста сустрэў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Пазней адбыліся перагаворы кіраўніка беларускай дзяржавы з прэм'ер-міністрам Пакістана. Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў вузкім складзе заявіў: ён разлічвае, што візіт прэм'ер-міністра Ісламскай Рэспублікі Пакістан выльецца ў стварэнне трывалай базы двухбаковага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Навазу Шарыфу за абавязковасць. «Мы дамовіліся ў гэты дзень і ў гэты час сустрэцца ў Мінску, і дзякуючы таму, што вы ўмееце трымацца свайго слова, мы з вамі ў гэты дзень і ў гэты час сустракаемся ў Мінску», — сказаў беларускі лідар.

Ён нагадаў, што на сустрэчы ў Ісламабадзе бакі дамовіліся, што гэты візіт будзе насычаны эканамічнымі мерапрыемствамі і выльецца ў стварэнне трывалай дагаворна-прававой базы паміж дзяржавамі. «Так яно і атрымалася. Мы маем намер па выніках перагавораў падпісаць паўтара дзясятка дакументаў», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што бакі сур'ёзна працавалі над падрыхтоўкай гэтага візіту. Пакістан наведалі прадстаўнікі дзелавых колаў Беларусі, міністры, у Беларусі пабывалі члены ўрада Пакістана, бізнесмены для вывучэння краіны з тым, каб пасля на найвышэйшым узроўні былі прыняты сур'ёзныя рашэнні.

СТАР. 2

ВІШНІ Ў МАЛІНАЎЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Малінаўцы сёлета небывалы ўраджай вішняў. Яшчэ ў мінулую суботу многія гаспадары здымалі апошнія ягады з дрэваў (на Лагойшчыне садавіна заўсёды спее пазней). Гаспадар аграсядзібы «У Лявона» Леанід ЗАГОРСКІ гасцінна запрашае пакаштаваць сапраўдную малінаўскую вішню.

СТАР. 6

КАШТОЎНАСЦІ, ВАРТЫЯ ТАГО, КАБ ІХ АБЕРАГАЦЬ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА даў інтэрв'ю «Звяздзе»

— Уладзімір Паўлавіч, з лёгкай рукі Палаты прадстаўнікоў разгарнулася найважнейшая палітычная кампанія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На ваш погляд, якое пытанне выбараў з'яўляецца галоўным?

— Думаю, яно ў тым, каб курс на паляпшэнне жыцця людзей, які паслядоўна праводзіцца дзяржавай, быў прадоўжаны.

СТАР. 3

■ Надвор'е

ПАСВЯЖЭЕ НА ВЫХАДНЫЯ

Гарачае надвор'е захаваецца і на бягучым тыдні. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

У аўторак ноччу тэмпература складзе +16-21 градус, месцамі — +12-15, днём чакаецца +27-34 градусы, па поўдні месцамі да +35. У сераду ноччу +15-22 градусы, днём будзе +30-36.

У чацвер месцамі, а ў пятніцу па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра 13 жніўня ноччу складзе +15-22 градусы, днём будзе +26-33 градусы, па поўдні да плюс 35. У пятніцу, 14 жніўня, уначы +15-22, днём — +26-31 градус, па поўдні да +32-35 градусаў.

У выхадныя ўсталюецца больш камфортнае надвор'е. Тэмпература паветра ноччу складзе +13-20 градусаў, днём будзе +24-29, а па паўднёвым захадзе захаваецца гарачае надвор'е, там чакаецца +30-33. Пераважна без ападкаў, толькі ў нядзелю па паўднёвым захадзе магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы.

Максімальная тэмпература за ўвесь час метэаралагічных назіранняў у сталіцы была зафіксавана 8 жніўня. Слупок тэрмометра падняўся да плюс 35,8 градуса. Ранейшы рэкорд складаў 35,6 градуса вышэй за нуль і быў адзначаны ў мінулым годзе. Тэмпература паветра 9 жніўня паднялася ў Мінску да +35,4. А ў Брэсце 9 жніўня была зафіксавана максімальная тэмпература за ўвесь час метэаралагічных назіранняў. Яна склала 36,7 градуса вышэй за нуль. Папярэдні рэкорд быў зафіксаваны 20 жніўня 1892 года і 13 ліпеня 1959-га — тады паветра прагрэлася да 36,6 градуса са знакам плюс.

ЗА СЛОВАМ — СПРАВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Наша павага да вас у Беларусі бязмерная. Вы той палітык, які можа быць прыкладам для любога палітыка ў свеце, і для мяне ў тым ліку. Ваша жыццё — гэта барацьба, гэта імкненне да тых мэт, якія вы ставілі перад сваёй камандай, перад сваёй партыяй, перад сваімі калегамі. Вашаму палітычнаму жыццю можа пазайздросціць любы. Вы прызнаны лідар народаў Пакістана, і мы гэтак жа вас сустракаем у Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Наваз Шарыф адзначыў, што ў Пакістане вельмі цёпла ўспрынялі нядаўні візіт Аляксандра Лукашэнкі. «Вы паклалі пачатак дружбе паміж нашымі краінамі, і сёння мы разглядаем наш візіт як працяг і далейшае ўмацаванне нашай дружбы», — падкрэсліў ён, звяртаючыся да беларускага лідара.

Прэм'ер-міністр Пакістана запрасіў Прэзідэнта Беларусі яшчэ раз наведаць гэтую краіну. «Цяпер, калі нашы адносіны становяцца ўсё больш трывалымі, я лічу, што нам трэба часцей сустракацца», — лічыць Наваз Шарыф.

Учора ж падпісаны Дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Пакістанам. Подпісы пад дакументам паставілі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і прэм'ер-міністр Пакістана Наваз Шарыф.

У прысутнасці Аляксандра Лукашэнкі і Наваза Шарыфа падпісаны таксама шэраг дакументаў у сферы гуманітарнага і рэгіянальнага супрацоўніцтва.



■ Выбары-2015

БОЛЬШ АКТЫЎНА

ПАВІННЫ ЗАЯЎЛЯЦЬ ПРА СЯБЕ ПАТЭНЦЫЯЛЬНЫЯ КАНДЫДАТЫ

Як стала вядома падчас пасяджэння Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, сёлета ў кандыдатаў у прэзідэнты будзе больш магчымасцей нагадаць пра сябе выбаршчыкам падчас агітацыйнай кампаніі.

Члены ЦВК разгледзелі чатыры пытанні, што закранаюць дэкларыванне даходаў і маёмасці, выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі, працу Інфармацыйнага цэнтра «Выбары-2015» і змяненні ў Палажэнне аб выбарчым фондзе асобы, што вылучаецца кандыдатам у прэзідэнты.

Перыяд перадвыбарнай агітацыі падоўжаны

— Мы падаўжаем парадак вядзення перадвыбарнай агітацыі, — паведаміла пасля пасяджэння **Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня ЦВК.** — Раней усё ўкладвалася ў двухтыднёвы перыяд, прынамсі прадастаўленне эфірнага часу. Зараз кандыдаты будуць у бясплатным эфіры месяц, што вельмі добра: гэта магчымасць напамінання пра сябе — спачатку ў тэлеэфіры, потым на радыё. Раней дэбаты праходзілі за два тыдні да датэрміновага галасавання, зараз яны пройдуць напярэдадні датэрміновага галасавання — гэта таксама лішняя нагода нагадаць выбаршчыкам пра сябе. Падоўжаны час тэледэбатаў, калі кандыдатаў будзе больш за пяць: раней прадастаўлялася гадзіна, колькі б іх ні прыйшло. Думаю, усе гэтыя магчымасці павялічваюць прысутнасць кандыдатаў у прэзідэнты ў эфіры, прытым бясплатна.

Падчас пасяджэння Лідзія Ярмошына паведаміла, што кандыдаты ў прэзідэнты будуць мець магчымасць выбраць: выступаць ім адразу ў прамым эфіры або скарыстацца запісам.

— Выступленне ў прамым эфіры — гэта не толькі вельмі рэйтынгава, але і цяжка, — адзначыла старшыня Цэнтральнай камісіі. — Нявопытныя кандыдаты, цалкам магчыма, пабаяцца выкарыстоўваць час у прамым эфіры, таму яны могуць папрасіць магчымасць запісу, а пасля гэтага можна будзе пры жаданні нешта адкарэктаваць.

Лідзія Ярмошына таксама паведаміла, што прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі будуць напярэдадні ўсіх перадач сустракацца з кандыдатамі і праводзіць для іх інструктаж. З такой просьбай раней да яе звярнуўся кіраўнік адной з ініцыятыўных груп. ЦВК зрабіла запыт у Белтэлерадыёкампанію, ці згодна яна на гэта, і тая пагадзілася. Такім чынам, просьба кіраўніка ініцыятыўнай групы задаволена.

Акрамя выступлення ў радыё- і тэлеэфіры, кожны кандыдат мае права надрукаваць бясплатна сваю перадвыбарную праграму ў асобных цэнтральных і абласных газетах. Пры гэтым тэкст павінен быць прадстаўлены не пазней за 20 верасня.

Кандыдат у прэзідэнты мае права за кошт сродкаў асабістага фінансавага фонду набываць эфірны час у тэле- і радыёэфіры, купляць месца ў друкаваных СМІ, а таксама на інфармацыйных рэсурсах.

Адкрыць фонд — права кожнага патэнцыяльнага кандыдата

Адказваючы на пытанне журналістаў аб неабходнасці фондаў (некаторыя кандыдаты іх пакуль не адкрылі), старшыня ЦВК адзначыла, што тут усё залежыць ад канкрэтнага прэтэндэнта.

— Адным грошы патрэбны, другім — не, — заўважыла яна. — Справа ў тым, што не ўсе тыя, хто адкрылі фонды, маюць паступленні. Да нас прыходзяць справаздачы — і там нулі. Але астатнія кандыдаты, напрыклад, спадар Калякін, спадарыня Караткевіч, спадарыня Рамаоўская, ужо здзяйсняюць аперацыі з гэтымі фондамі. Туды паступаюць грошы. Ужо нават здзейснена аплата нейкіх паслуг з аднаго з фондаў. Таму гэта права кожнага патэнцыяльнага кандыдата.

Учора ЦВК абнародавала інфармацыю пра агульную суму сродкаў, што паступілі ў выбарчыя фонды прэтэндэнтаў на пост Прэзідэнта. Па стане на 5 жніўня на рахунак Сяргея Калякіна паступіла 3 млн 326 тысяч рублёў, з іх ужо зрасходавана 1 млн 725 тысяч. На рахунак Таццяны Караткевіч паступіла 7 069 375, пакуль што расходаў не было. На рахунак Жанны Рамаоўскай было пераліча на 144 тысячы, расходаў пакуль таксама не было.

Часцей выходзіць да людзей

Журналісты папрасілі старшыню Цэнтральнай камісіі пракаментаваць яе ранейшае выказванне пра тое, што выбарчая кампанія ідзе залішне ціха. Добра гэта ці дрэнна?

— Для мяне гэта добра, для выбаршчыкаў — не вельмі, — адказала старшыня ЦВК. — Думаю, патэнцыяльныя кандыдаты павінны заяўляць пра сябе, выходзіць часцей да людзей. Хаця б з дапамогай інтэрнэта — выкарыстоўваць гэтую магчымасць. Хацелася б, каб кіраўнікі ініцыятыўных груп, самі прэтэндэнты на пост Прэзідэнта бадзёра расказвалі, колькі яны сабралі подпісаў, з якімі складанасцямі сутыкаюцца. У гэтай працы трэба пра сябе часцей заяўляць і часцей інфармаваць.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■

■ Выбірай.by!

УРОКІ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Адкрытыя дэбаты БРСМ «Выбірай.by!» — гэта пляцоўка, на якой моладзі даецца магчымасць не толькі выказацца, але і быць пачутай. Маладыя лідары (а іх сабралася ў сценах Нацыянальнай бібліятэкі амаль дзве сотні з усёй краіны) разважалі і спрачаліся на тэму «Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь». Адметна, што вопытнымі экспертамі, для якіх будучая выбарчая кампанія далёка не першая, выступалі старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія ЯРМОШЫНА, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ, першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ і іншыя дзяржаўныя дзеячы.

Фота БЕЛТА.

Лідзія Ярмошына выказала думку пра тое, што моладзь болей актыўна, чым у мінулыя гады, бярэ ўдзел у выбарчым працэсе:

— Мне здаецца, прынамсі так выглядае ў інфармацыйным плане, што ў гэтай выбарчай кампаніі моладзь удзельнічае больш актыўна. Яна часцей заяўляе пра сябе, прэзентуе крэатыўныя праекты. І праект «Выбірай.by!», і ў тым ліку сённяшнія дэбаты — гэта тыя мерапрыемствы, якія цалкам, магчыма, выхаваюць адказных выбаршчыкаў.

Старшыня ЦВК таксама прызналася, што задаволеная і ўвагай СМІ да сёлетняй кампаніі па выбарах Прэзідэнта:

— Калі б гэтай увагі не было, то выбаршчыкі забываліся б пра тое, што ў нас ідзе выбарчая кампанія. Па сутнасці, сродкі масавай інфармацыі ўзялі на сябе функцыю шматлікіх патэнцыйных кандыдатаў на пасаду кіраўніка дзяржавы, якія паводзяць сябе залішне сціпла.

Андрэй Белякоў падкрэсліў, што асноўная мэта дэбатаў — абмеркаванне актуальных пытанняў ва ўсіх сферах жыцця.

— Гэты праект вельмі важны для нас, таму што праз дэбаты мы вучым моладзь. Маладыя людзі сёння павінны ўмець адстойваць сваё меркаванне, арыентавацца ў вялікай колькасці інфармацыі, — кажа Андрэй Белякоў. — Сёння для моладзі няма тэм забароненых, тых, якія трэба замоўчваць. Усё, што заўгодна, можна абмяркоўваць. Самае галоўнае, каб праз гэтае абмеркаванне мы прыходзілі да канструктыўных высноў. Каб спрэчка не руйнавала, а стварала ісціну.

Выбары Прэзідэнта — значная палітычная падзея, але для моладзі гэта яшчэ і магчымасць праявіць і зарэкамендаваць сябе, магчымасць зносін, вывучэння праблем, з якімі сутыкаюцца людзі. Моладзь вучыцца праз выбарчыя тэхналогіі, і такія ўрокі паслужаць добрым стымулам для далейшага прасоўвання ў палітычным жыцці, грамадскай дзейнасці, — пераканаы Андрэй Белякоў.

Моладзевыя дэбаты прайшлі ў 3 туры. Першы — прадстаўленне каманд (іх было дзве: Голас народу і Выбар маладых), другі — пытанні адно да аднаго, трэці — адказы на пытанні экспертаў. Падчас іх маладыя людзі выказалі некалькі даволі важных думак. Напрыклад, прапанавалі знізіць узрост для прыняцця на пасаду Прэзідэнта краіны да 31 года. І прыйшлі да высновы, што не так важна, правага, левага ці цэнтрысцкага кшталту палітычны лад дзяржавы: галоўнае, каб жыццё ішло ў мірным рэчышчы і кожны мог сумленна і спакойна працаваць. Увогуле, удзельнікі прыемна ўразілі экспертаў. А пад канец дэбатаў усім прысутным раздалі яблыкі ўжо гэтага года, якія сімвалізуюць, што прыйшоў час збіраць ураджай незалежнай дзяржавы.

Вераніка ПУСТАВІТ
pustavit@zviazda.by

■

■ Сітуацыя

АХВЯРЫ СПЯКОТЫ

— Толькі за мінулыя выхадныя, калі па ўсёй краіне ставіліся тэмпературныя рэкорды, у экасістэмах зарэгістравана 113 пажараў, — паведаміў **прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Амаль усе пажары здарыліся праз чалавечы фактар. У такое сухое надвор'е лес, тарфянік, трава могуць успыхнуць усяго ад аднаго недакурка, запалкі ці нават проста ад кантакту з распаленымі часткамі аўтамабіля.

У суботу памёр 92-гадовы дзед, які атрымаў трыма днямі раней моцныя апёкі на пажары сухой травы ў вёсцы Залужжа Стаўбцоўскага раёна. У гэты ж дзень у Валожынскім раёне на полі каля вёскі Пастаянцы загарэўся камбайн. Агонь на карню знішчыў 8 гектараў пшаніцы. Супрацоўнікі МНС пры гэтым здолелі адстаяць 20 гектараў з няўбраным збожжам.

Зводкі ж з вадаёмаў краіны ўвогуле нагадваюць даныя з месцаў баявых дзеянняў.

— За мінулы тыдзень патанулі 35 чалавек, пры гэтым 25 — за выхадныя, — расказаў **вядучы спецыяліст Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Усе няшчасныя выпадкі адбыліся на так званых дзікіх пляжах — у месцах, непадкантрольных ратаўнікам. Заклікаем тых, хто адпачывае на вадзе, рабіць гэта ў тых месцах, дзе размешчаны спецыяльныя пасты.

Валяр'ян ШКЛЕННІК
schklennik@zviazda.by

■

■ Добрая навіна

ДЗЯСЯТКІ НОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

Дазволіць стварыць адкрыццё двух новых прадпрыемстваў у Дзяржынскім раёне

Як паведаміла **начальнік аддзела інвестыцый камітэта эканомікі Мінскага аблвыканкама Лізавета ДАВЕЛЬМАН,** у Фаніпалі прадпрыемства «Эвіпак Індастрыз» рэалізуе праект па будаўніцтве вытворчай базы (інсталяцыя аўтаматызаванай вытворчай лініі аўстрыйскай кампаніі SML па вытворчасці стрэтч-плёнкі) і інжынерных камунікацый. Інвестыцыйны дагавор заключаны ў чэрвені 2010 года, а на сёння асвоена больш за 66 млрд інвестыцый. «Выпуск высакаякаснай пяцслойнай стрэтч-плёнкі дазволіць вырашыць узрастаючую патрэбу ў гэтай прадукцыі як на беларускім рынку, так і на рынках блізкага замежжа. Плануецца, што новы аб'ект вытворчасці ўвядуць у эксплуатацыю ў снежні, тут будзе створана каля 20 новых працоўных месцаў», — адзначыла спецыяліст аблвыканкама.

Завяршаецца будаўніцтва аб'екта прадпрыемства «ФераліБел» па арганізацыі вытворчасці электрычных награвальнікаў і ацяпляльных катлоў на тэрыторыі Дзяржынскага раёна. Работы вядуцца з сакавіка гэтага года, фактычны аб'ём асвоеных інвестыцый склаў каля 50 млрд рублёў. Пасля завяршэння плануецца стварыць больш за 50 новых працоўных месцаў. Прадукцыя прадпрыемства будзе пастаўляцца ў Расію, Украіну, Казахстан, Узбекістан, краіны Балтыі.

Акрамя таго, працягваецца рэалізацыя інвестыцыйнага праекта закрытага акцыянернага таварыства «Амкадор-эластамер» па вытворчасці гумовых сумесяў, формавых і няформавых гуматэхнічных вырабаў у Фаніпалі. Будаўніцтва аб'екта пачалося чатыры гады таму і завершыцца, як мяркуецца, у снежні 2016 года. Усяго плануецца асвоіць каля Br330 млрд інвестыцый, па выніках будзе створана больш за 50 новых працоўных месцаў. Дзякуючы прадпрыемству, у Мінскай вобласці з'явіцца імпартазамяшчальная вытворчасць кольцаў, утулак, ушчыльняльнікаў, дыванкоў для айчыннага машынабудавання.

Па словах Лізаветы Давельман, у другім квартале гэтага года ў Дзяржынску таварыства з абмежаванай адказнасцю «Элезер» адкрыла прадпрыемства па вытворчасці сродкаў механізацыі пасляўборачнай апрацоўкі збожжа на аснове набыцця абсталявання вядучых сусветных кампаній. Аб'ём фактычна асвоеных інвестыцый склаў больш за Br85 млрд, створана 77 новых працоўных месцаў. Інвестыцыйны праект накіраваны на імпартазамяшчэнне машын і абсталявання, якія выкарыстоўваюцца ў складзе ачышчальна-сушыльных зернякомплексаў

■

КАШТОЎНАСЦІ, ВАРТЫЯ ТАГО, КАБ ІХ АБЕРАГАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Час цяпер вельмі складаны. Як вы мяркуеце, што больш за ўсё патрэбна Беларусі для далейшага руху наперад?

— На цяперашнім этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці і грамадства нам патрэбны найперш палітычная стабільнасць, пэўнасць і бяспека. У сённяшніх міжнародных умовах гэта нам неабходна, я перакананы, больш, чым што-небудзь яшчэ. На прыкладах блізкага, ды і далёкага замежжа мы бачым, якой слабай, безабароннай становіцца краіна, дзе ўзнікае нестабільнасць. Яна не дае нармальна працаваць ні кіраўніку дзяржавы, ні ўраду, ні парламенту, наносіць вялікую шкоду эканоміцы, сацыяльнай абароненасці, светапогляду і дабрабыту людзей. У нас жа, нягледзячы на існуючыя эканамічныя праблемы і знешнія выклікі, прынцыпова іншая сітуацыя, — грамадскі мір, спакой і бяспека. Безумоўныя каштоўнасці. Яны вартыя таго, каб іх аберагаць.

— Якім чынам гэта робіць парламент?

— Праз прыняцце законаў, якія забяспечваюць прававую аснову сацыяльна-эканамічнай палітыкі, умацавання нацыянальнай бяспекі, рэалізацыі канстытуцыйных правоў грамадзян і развіцця міжнароднага супрацоўніцтва нашай краіны. На гэта працуе ўся нарматыўная база.

— Дэпутатаў цікавіць рэакцыя людзей на заканадаўчыя рашэнні?

— Цікавіць не толькі на прынятыя, але і мяркуемыя да прыняцця. Больш прадуктыўнага шляху да павышэння якасці заканадаўства проста не існуе. Яно ўдасканальваецца і перыядычна абнаўляецца менавіта з улікам патрабаванняў часу, правапрымяняльнай практыкі і грамадскай думкі. Профільныя камісіі Палаты прадстаўнікоў пастаянна працуюць з экспертнай супольнасцю і грамадскімі арганізацыямі, прычым дыялог з грамадскасцю вядзецца ў розных фарматах, у тым ліку на прадпрыемствах, ва установах і арганізацыях, а таксама падчас рэгулярных сустрэч з выбаршчыкамі. Гэта дае нам магчымасць не траціць сувязі з рэаліямі жыцця, прагназаваць наступствы тых ці іншых прававых рашэнняў і рухаць заканатворчасць у патрэбным напрамку.

— Нават апаненты ўлады прызнаюць апераджальны характар законаў, накіраваных на ўмацаванне нацыянальнай бяспекі, законнасці і правапарадку.

— Адну са сваіх найважнейшых задач мы бачым у тым, каб ставіць прававыя бар'еры для ўзнікнення сітуацый і працэсаў, якія маглі б пагражаць грамадскай і дзяржаўнай бяспецы, каб любыя спробы парушыць грамадскі мір, правакаваць супрацьпраўныя дзеянні рашуча спыняліся. І гэта паслядоўна рэалізуецца ў заканадаўстве. Прыгадаю грамадскае абмеркаванне праекта Закона «Аб барацьбе з карупцыяй», ініцыяванае кіраўніком дзяржавы. Яно паказала, што людзі ўпэўнены ў здольнасці дзяржавы на належным узроўні забяспечыць грамадскі парадак, абараніць іх ад усялякага роду злачынных дзеянняў і пагроз.

— На нядаўняй сустрэчы з вамі Прэзідэнт заклікаў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў актывізаваць работу ў выбарчых акругах. На чым дэпутаты засяродзілі ўвагу?

— На дапамозе рэгіёнам у вырашэнні канкрэтных праблем. Тут у нас ёсць добрыя напрацоўкі. Яны звязаны з такімі важнымі сацыяльна-эканамічнымі пытаннямі, як добраўпарадкаванне, водазабеспячэнне і газіфікацыя населеных пунктаў, мадэрнізацыя вытворчай базы прадпрыемстваў, рэканструкцыя і рамонт дарог, жылля, устаноў адукацыі, аховы здароўя і іншымі. Займаемся таксама асабістымі просьбамі грамадзян, аказваем магчымую дапамогу.

— Але ж не ўсё залежыць ад дэпутата.

— Згодны, не ўсё, але нямала можна зрабіць, працуючы ў цесным кантакце з мясцовымі органамі ўлады і кіраўніцкімі структурамі розных узроўняў. Мы ў гэтым пераканаліся.

— Ці не атрымліваецца, што дэпутат у пэўнай меры выконвае ролю службы хуткага рэагавання на прашэнні і скаргі?

— Я не ставіў бы так пытанне, таму што парламентарый як народны выбраннік і заканадаўца павінен ведаць сітуацыю ў выбарчай акрузе, быць у курсе ўсяго, што клапоціць і турбуе людзей, сустракацца з працоўнымі калектывамі, інфармаваць пра новыя законы, растлумачваць меры, якія прадпрымае дзяржава па вырашэнні эканамічных праблем. Вельмі важна таксама, каб людзі разумелі, што пераадоленне існуючых цяжкасцей у многім залежыць ад пошуку і выкарыстання мясцовых рэзерваў эканамічнага росту, ад высокаэфектыўнай працы кожнага прадпрыемства, кожнага чалавека на сваім рабочым месцы. У перыяд выбарчай кампаніі такія акцэнты дэпутацкай дзейнасці ў выбарчых акругах нам ўяўляюцца асабліва значнымі.

— Вы лічыце, што запатрабаванасць актыўнай грамадзянскай пазіцыі дэпутатаў парламента ўзрасла?

— Узрасла роля не толькі дэпутатаў парламента, але і мясцовых Саветаў. Вырашаючы з імі канкрэтныя пытанні тэрыторый і рэгіёнаў, мы зыходзім з інтарэсаў выбаршчыкаў, грамадства і дзяржавы і робім агульную справу. А яна заўсёды накіравана на практычны вынік — эканамічны, вытворчы, сацыяльны. Там, дзе ён дасягаецца шчыльнай сумеснай працай з выканаўчымі органамі, прадпрыемствамі, установамі і грамадскімі арганізацыямі, дзейсным клопатам аб простым чалавеку, ёсць, як пацвярджае жыццё, і вынік палітычны — давер людзей да ўлады.

— Без яго ў грамадстве наўрад ці б усталяваліся каштоўнасці, пра якія вы гаварылі напачатку інтэрв'ю, — грамадскі мір, спакой і бяспека, тым больш што ёсць і немалазначны знешні фактар.

— Гэта сапраўды так. Дзякуючы міралюбівай знешняй палітыцы кіраўніка нашай дзяржавы і яго мірным ініцыятывам па ўрэгуляванні крызісу ва Украіне расце міжнародны аўтарытэт Рэспублікі Беларусь. Намецілася тэндэнцыя паляпшэння ўзаемаадносін з Захадам. З актыўным удзелам нашай краіны будуецца выгаднае для Беларусі, Расіі, Казахстана, Арменіі і Кыргызстана супрацоўніцтва ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Працягвае развівацца беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў фармаце Саюзнай дзяржавы, якое дазваляе вырашаць рознапланавыя задачы. Лічу вельмі важным тое, што склалася шырокая грамадская згода ў адносінах да нацыянальных інтарэсаў і прыярытэтаў на міжнароднай арэне.

— Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў адчуваюць сваю далучанасць да знешняй палітыкі дзяржавы?

— Парламентарыі актыўна ў ёй удзельнічаюць. Паслядоўна пашыраецца юрыдычная база міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь. Маю на ўвазе ратыфікацыю міжнародных пагадненняў і дагавораў, дзе ключавы сегмент — удасканаленне прававога механізма еўразійскай эканамічнай інтэграцыі. За апошнія гады ўшчыльніўся парадак нашых міжпарламенцкіх і міжнародных кантактаў, геаграфія якіх ахоплівае прастору СНД, Заходнюю і Цэнтральную Еўропу, Азію, Афрыку, Паўднёвую Амерыку. Пры гэтым мы працуем як на двухбаковым узроўні, так і на міжнародных парламенцкіх пляцоўках. Асабліва актыўна ідзе дыялог з парламентарыямі Паўднёва-Усходняй Азіі.

— Якая мэта беларускай парламенцкай дыпламатыі?

— Ва ўмовах жорсткай міжнароднай канкурэнцыі неабходна ўмацоўваць пазіцыі Беларусі ў сусветнай эканоміцы. Таму інтарэсы нашай парламенцкай дыпламатыі перш за ўсё ў эканамічнай сферы. Садзейнічаць умацаванню і развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з замежнымі краінамі — такая галоўная задача, якую мы вырашаем парламенцкімі сродкамі.

— З вашага пункту гледжання, наколькі магчыма ў бліжэйшай перспектыве, каб Нацыянальны сход Беларусі і Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы выйшлі на новы ўзровень адносін?

— Гэта залежыць ад далейшага змястоўнага напаўнення ўзаемаадносін Рэспублікі Беларусь і Еўрасаюза, ад зацікаўленасці ЕС і ПАСЕ ў пашырэнні поля двухбаковых кантактаў на раўнапраўнай аснове. Калі праз канструктыўны дыялог будзе дасягнута разуменне па тэмах, дзе ёсць разыходжанні ў пазіцыях, то рух наперад не прымусіць сябе доўга чакаць. Мы адкрытыя для супрацоўніцтва.

— Гісторыя паскорылася. Сітуацыя ў свеце мяняецца літаральна на вачах. Якім, на вашу думку, павінен быць падыход парламентарыяў да яе?

— Рэальным. Заўсёды і незалежна ад сітуацыі.

— У кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удзельнічаюць розныя палітычныя сілы. Як вы лічыце, ці ёсць нешта агульнае, чаго патрабуе ад іх наш складаны час і будучыня краіны?

— Адказнасць за свае словы, заклікі і і дзеянні. Аднак, на жаль, яна ёсць не ва ўсіх.

— На выбарах 11 кастрычніка будзе зроблены правільны выбар? Як вы лічыце?

— Наш народ здольны да безпамылковай палітычнай селекцыі. Я ў гэтым не сумняваюся.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

■ Насустрач школе

ПЕРШЫЯ ЗВАНКІ — У АПОШНІ ДЗЕНЬ ЛЕТА

Свята першага школьнага звонка пройдзе ва ўсіх сталічных установах агульнай сярэдняй адукацыі 31 жніўня.

На сёння ў сталіцы працуюць 243 школы. У новым навучальным годзе за школьныя парты сядуць каля 171 тысячы навучэнцаў. Усяго ў мінскіх школах плануецца адкрыць больш за 900 першых класаў для 23 440 дзяцей і 394 дзясятыя класы (206 профільных і 188 — агульнаадукацыйных).

Пашпарты гатоўнасці да новага навучальнага года ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі Мінска павінны атрымаць да 20 жніўня. На падрыхтоўку школ і дзіцячых садкоў да новага навучальнага года з бюджэту сталіцы выдзелена 241,4 млрд рублёў. Таксама на гэтыя мэты накіравана 8,5 млрд рублёў пазабюджэтных сродкаў і 17,7 млрд рублёў шэфскай і спонсарскай дапамогі.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі адрамантавана 8,4 тыс. кв. м дахавых пакрыццяў, 13 харчблокаў, дзве абедзенныя залы, фасады васьмі школ, выкананы рамонт 12 ценявых падстрэшкаў. Таксама ў гэтым годзе плануецца завяршыць добраўпарадкаванне тэрыторый сямі ўстаноў адукацыі. На капрамонце знаходзіцца 12 школ.

1 верасня ва ўсіх школах Мінска пройдуць урокі на тэму «На цябе, наша моладзь, надзея!». Таксама Камітэтам па адукацыі распрацавана больш за 20 гасцявых урокаў у рамках гарадскога праекта «Я — мінчанін». Традыцыйна ўдзел у мерапрыемствах возьмуць прадстаўнікі органаў заканадаўчай, выканаўчай улады, мясцовага самакіравання і грамадскіх арганізацый.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

СУСЕД: НАЙЛЕПШЫ СЯБАР ЦІ ЛЮТЫ ВОРАГ?

Чаму людзі не хочуць ісці на саступкі адзін аднаму

Больш як 14 чалавек выслухаў падчас выязнога прыёму ў Дзяржынскім раёне старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра. Не абышлося і без скаргаў на «бліжняга свайго». Хтосьці выказваў незадаволенасць, што ў суседа зямельны надзел большы, чым у яго, нехта не можа падзяліць жылплошчу са сваякамі. «Як паказвае практыка, каля 60-70% зваротаў грамадзян тычацца асабістых спрэчак. Справа даходзіць да таго, што ўжо пачынаюць дзяліць зямлю на могілках», — канстатаваў Сямён ШАПІРА.

У прыватнасці, адна з заяўніц распавяла, што на могілках у Дзяржынскім раёне пахавана яе радня. Побач знаходзяцца магілы іншых нябожчыкаў. Дык вось сваяк апошніх парушыў заканадаўства, прыхапіўшы «чужую» зямлю. У сувязі з гэтым жанчына папрасіла пашырыць участак, дзе ляжаць яе блізкія, на 30 сантыметраў. Але, як высветлілася, мужчына ні ў чым не вінаваты: адлегласць паміж помнікамі нават большая, чым патрабуюць стандарты. Разам з тым, як стала вядома, магілы блізкіх людзей скаржніцы знаходзяцца ў непрыглядным стане. «Вы скардзіцеся старшыні аблвыканкама, але пры гэтым нічога не зрабілі, каб прыбраць магілы сваіх родных», — абурыўся Сямён Шапіра.

Сапраўды, прыватныя пытанні можна вырашыць самім, за агульным сталом, за кубкам гарбаты. Каб жыць у згодзе ды ладзе з суседзямі, варта быць мудрым ды памяркоўным, улічваць не толькі свае інтарэсы, але і інтарэсы іншых. Часта суседзі бываюць добрымі сябрамі. Але непрадуманымі дзеяннямі, няўменнем ці нежаданнем ісці на саступкі іх можна зрабіць лютымі ворагамі.

Жыхароў раёна хвалююць і праблемы прыватызацыі жылля, зямельных участкаў.

Напрыклад, муж і жонка паскардзіліся на вялікі кошт, што ім налічылі пры прыватызацыі кватэры. Як яны растлумачылі, яшчэ год таму пры разліках была дапушчана памылка: кошт жылля завышаны на 30 млн рублёў. Яе выправілі і выставілі сапраўдную цану, што адпавядала спажывецкім уласцівасцям жылля: 78 млн рублёў. Але гаспадароў не задаволіла такая сітуацыя. Пакуль яны вагаліся, закончыўся тэрмін, адведзены заканадаўствам для рэгістрацыі дагавора. Зразумела, што за гэты час змяніўся і каэфіцыент, і цяпер давядзецца заплаціць ужо больш як 130 млн рублёў. Старшыня аблвыканкама даручыў юрыстам дасканала вывучыць сітуацыю і пры магчымасці дапамагчы заяўнікам вярнуць першапачатковую цану. Але між іншым ён дадаў, што вырашыць праблему можна будзе, хутчэй за ўсё, праз суд.

Што тычыцца пытанняў добраўпарадкавання, то ў Дзяржынску яно ідзе, так бы мовіць, поўным ходам. Уладкоўваюцца цэнтральныя вуліцы і двары. Нягледзячы на тое, што горад не стане спадарожнікам сталіцы, як меркавалася раней, да канца года адкрыюцца 4 прадпрыемствы па выпуску імпартазамяшчальнай прадукцыі, а ў кастрычніку адчыніць дзверы новы дзіцячы сад.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

«КАМАРОЎКА» ЗАПРАЦУЕ З 7 РАНІЦЫ,

а фермеры змогуць рэалізоўваць прадукцыю без абмежаванняў па часе

Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Андрэй ДАМАРАЦКІ, які адказваў на тэлефанаванні мінчан у мінулую суботу, адзначыў, што колькасць званкоў на «прамую лінію» з мая знізілася ўтрая. На яго думку, гэта сведчыць аб тым, што «прамыя лініі» садзейнічаюць хуткаму вырашэнню пытанняў.

Адзін са званкоў паступіў ад дырэктара сталічнага ўнітарнага прадпрыемства. Ён збіраецца стварыць на Камароўскім рынку некалькі аб'ектаў грамадскага харчавання, развіваць беларускую кухню. Пры складанні дагавора паміж прадпрымальнікам і прадпрыемствам «Мінскі Камароўскі рынак» паўсталі некаторыя няўвязкі. Прасіў дапамагчы. На наступным тыдні з бакамі сустрэнуцца спецыялісты дзяржмаёмасці і дапамогуць улічыць у дакументе і прапановы прадпрымальніка, і інтарэсы Камароўскага рынку.

Многія тэлефанавалі і прасілі змяніць рэжым працы рынкаў, пачынаць яе раней, бо ўдзень закупляць прадукты цяжка праз моцную спёку. Гэтае пытанне было вырашана адразу ж. Цяпер Камароўскі рынак будзе даступны для пакупнікоў з 7 гадзін раніцы. Таксама ў фермераў з'явілася магчымасць гандляваць сваёй прадукцыяй не да пэўнай гадзіны, а да таго часу, пакуль яна не будзе прададзена.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. seradzyuk@zviazda.by

Ігуменскі тракт
№ 29 (130)

Край, дзе я жыву
Сумесны праект газеты «Звязда» і РГА «Белая Русь»

А ЗЯЛЁНЫ ЯВАР КУДРАВЫ

Ці расце ў Вішове «дрэва Вечнасці»?

Гаворачы пра багацце гісторыі нашай краіны, жартуюць: «Дзе ні станеш, абавязкова трапіш у гістарычнае месца». Але ў большасці выпадкаў падарожжы па знакавых месцах суправаджаюцца словамі: «Тут было... А там некалі стаяла...» Час не шкадуе ні пабудоў, ні мясцін, ні людзей... Але застаюцца маўклівыя сведкі — велізарныя дрэвы.

Знаёмая паведаміла, быццам у нас — у аграгарадку Вішоў (Бялыніцкі раён Магілёўскай вобласці) — расце міфалагічнае дрэва явар. Памятаеце песню?

Благаславі, маці, вясну сустракаці.
А зялёны явар кудравы.
Вясну сустракаці, зіму замыкаці,
А зялёны явар кудравы.

Народныя ўяўленні пра явар мелі на ўвазе некалькі дрэў — і асіну звычайную, і белы клён, і серабрыстую таполю. Дрэвы, пра якія мне нагадалі, ведаюць многія мясцовыя жыхары. Знешне і па форме лістоты яны нагадваюць асіну, але вышэйшыя. Увосень іх лісце ярка-жоўтага колеру і мае хвалістыя рабрынкі. А на маладых парастках яно ўвогуле нагадвае кляновае лісце, толькі маленькае па памеры.

Добра пакапаўшыся ў розных крыніцах і параіўшыся з біёлагамі, прыйшла да высновы, што вішоўскае «дрэва Вечнасці» — гэта серабрыстая таполя (Populus alba), якая з'яўляецца блізкім родзічам асіны. Дарэчы, лісты гэтага дрэва знізу маюць «замшавую» паверхню, таму пры моцным ветры адліваюць срэбрам. Яго белую драўніну раней выкарыстоўвалі для вырабу рэчаў хатняга ўжытку.

Вішоўскія таполі сапраўды вечныя, бо нават наўздагад ім можна даць 100-150 гадоў. Старажылы расказваюць, што на тым месцы, дзе яны зараз растуць, быў некалі вялізны парк з рэдкімі дрэвамі, закладзены ў XIX стагоддзі мясцовым памешчыкам, стацкім саветнікам Мікалаем Савіцкім, які, акрамя парку, загадаў пасадзіць вялікі пладовы сад і бэзавую алею даўжынёй больш як паўкіламетра. Адметнасцю пладовага саду былі вялікія плантацыі агрэсту і парэчак, якія захаваліся да другой паловы XX стагоддзя. Па ўспамінах вяскоўцаў, маёнтак Савіцкага быў двухпавярховы, з чырвонай цэглы. Да вайны ў ім знаходзілася МТС, а панскі двор і гаспадарчыя пабудовы былі заняты пад сельскагаспадарчыя машыны. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў маёнтку размяшчаўся нямецкі гарнізон. Адыходзячы, немцы разбамбілі будынак. Напрыканцы 50-х гадоў руіны маёнтка разабралі, а з яго цэглы пабудавалі памяшканні бальніцы. Ад пладовага саду, парку і бэзавай алеі нічога не засталося. На іх месцы зараз стаяць шматпавярховыя дамы і дзіцячы садок. Толькі некалькі серабрыстых таполяў, маўклівых сведак мінулых падзей, як і раней, буяюць зялёнай лістотай.

Святлана МАГІЛЕЎЧЫК

■ Калекцыя

НЕ МАРКАМІ АДЗІНЫМІ

Як жыхар вёскі Лунна сабраў унікальную філатэлістычную калекцыю на біблейскую тэму

Кажуць, што шляхі Божыя неспазнаныя — ніколі не ведаеш, дзе і як напаткае цябе найвышэйшая сіла. Гэта пацвярджае і прыклад жыхара вёскі Лунна Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці Лявона КАРПОВІЧА. Працуючы школьным настаўнікам, 15 гадоў таму ён вырашыў, што будзе калекцыянаваць маркі. Каб не сапернічаць з карыфеямі, прагледзеў тыя тэмы, якія ўжо збіраюць іншыя, бо не хацеў паўтарацца. Ён знайшоў вольную нішу і пачаў збіраць маркі на біблейскую тэму. Так распачаўся яго шлях да спазнання дабра і зла: ён вучыўся таму, што ёсць сапраўдная любоў і міласэрнасць.

Намеснік старшыні Беларускага саюза філатэлістаў Леў КОЛАСАЎ адзначае, што калекцыя, якую сабраў жыхар вёскі Лунна, надзвычай грунтоўная і пазнавальная, да таго ж атрымала высокую ацэнку спецыялістаў. Ён дадае, што, нават калі ты ніколі не чытаў Біблію, прагледзеўшы тое, што сабрана гэтым калекцыянерам, можна скласці пэўнае ўяўленне пра падзеі, апісаныя ў гэтай кнізе.

Сам **Лявон Карповіч** адзначае:

— Біблія — кніга, якая найбольш выдавалася. Да таго ж яе чытаюць больш за ўсё, прычым на ўсіх мовах. Гэта Святая Кніга. Ёй прысвечана шмат твораў мастацтва. Тыя ж да Вінчы, Далі, Караваджа абавязкова малявалі на біблейскія тэмы. У пазнейшыя часы пошты іх краін змяшчалі карціны на марках. Вывучаючы ўсё гэта, чалавек надзвычай узбагачаецца, далучаецца да здабыткаў сусветнай мастацкай культуры.

Ёсць на марках, сабраных калекцыянерам, і беларускія творы мастацтва. Напрыклад, «Нараджэнне маці Божай» — гэта ікона, на якой стаіць подпіс «Яўсевіч». Рэдкі выпадак, як адзначае збіральнік, бо раней іконы часцей не падпісваліся.

Сярод унікальных экспанатаў сваёй калекцыі аўтар называе марку 1996 года, выпушчаную ў Канадзе. Яе адметнасць у тым, што гэта першая марка, прысвечаная нараджэнню Хрыста, пра што сведчыць не толькі малюнак, але і словы, змешчаныя на ім.

Паштоўка з выявай гары Сінай — таксама каштоўны для гэтага збіральніка экспанат, бо на ёй адлюстравана тое месца, дзе Майсей атрымаў скрыжалі запавета. Гэтая паштоўка была выпушчана ў 1903 годзе.

Некаторыя экспанаты больш познія, але даволі рэдкія, бо выйшлі абмежаваным тыражом. Цяпер знайсці такія разыначкі калекцыі дапамагае інтэрнэт, але раней адшукаць іх было амаль немагчыма. Ёсць маркі, на якіх адлюстраваны пакаранне агнём гарадоў Садома і Гаморы, падарожжа вешчуноў, каб пакланіцца нованароджанаму Ісусу, небаўзяцце Панны Марыі і многае іншае.

Калекцыю ілюструе апісанне, зробленае самім аўтарам, на беларускай мове. Яно дапамагае яшчэ лепш зразумець біблейскія падзеі. Часам выявы суадносяцца з пэўнымі вершамі са Святога Пісання.

Лявона Карповіча запрашаюць з яго калекцыяй выступаць перад самымі рознымі аўдыторыямі. І ён распавядае, даносіць да людзей тыя важныя ісціны, што ўвасоблены ў яго марках. Сам ён яшчэ працягвае вучыцца адрозніваць дабро ад зла, імкнецца першым перамагаць другое... Аднак можна сцвярджаць, што яго калекцыя — акурат крок да лепшага ў гэтым свеце.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by
Фота аўтара.

■ Мінулае

КАЛІ ГЛЯДЗЕЦЬ НА СТАРЫЯ ЧОРНА-БЕЛЫЯ ФОТАЗДЫМКІ

з азартам першаадкрывацеля

Супрацоўніца карэліцкага краязнаўчага музея Святлана КОШУР кожны будні дзень знаходзіцца ў пошуку і час ад часу атрымлівае каштоўныя матэрыялы, што глыбей адкрываюць мінулае Карэлічаў і раёна. Шкада было б не перадаць гэтыя знаходкі шырокай аўдыторыі (іх можна пабачыць таксама на выставах музея). Таму далей публікуем аповед Святланы пра экспанаты, што былі адшуканы ў Нацыянальным архіве і нават у сямейных альбомах землякоў, якія паказваюць жыццё сведак гісторыі гэтай зямлі.

Адзін з артэфактаў пераносіць нас у пачатак мінулага стагоддзя. На фотаздымку былы начальнік карэліцкай пошты Богуш Павел Антонавіч. Аднавіць яго біяграфію сёння даволі складана. Вядома, што нарадзіўся ён у Карэлічах у 1860 годзе, у пачатку мінулага стагоддзя быў начальнікам паштова-тэлеграфнага аддзялення ў тым жа мястэчку. З тых часоў захаваўся цікавы дакумент — спецыяльны страхавы поліс Таварыства страхавання жыцця Злучаных Штатаў, афармлены праз адпаведныя службы ў Санкт-Пецярбургу, з якога вынікае, што Павел Антонавіч у 1901 годзе застрахаваў сваё жыццё на 1000 рублёў (на пачатку мінулага стагоддзя конь каштаваў 100-200 рублёў, пуд жыта — 80 капеек, дзесяціна зямлі — 100-120 рублёў). Яшчэ адзін унікальны дакумент — чарцёж ходу пошты па Мінскай паштова-тэлеграфнай акрузе, якім зямляк карыстаўся на службе.

Праз рукі Паўла Богуша праходзіла ўся карэспандэнцыя, што атрымлівалі жыхары мястэчка, у тым ліку лісты Якуба Коласа, якія паэт дасылаў настаўніцы Карэліцкага гарадскога вучылішча Аляксандры Рамановіч (Зотавай).

Была ў жыцці Паўла Антонавіча таямнічая гісторыя кахання да прыгажуні Фацініі Мачульскай, якую ён лічыў сваёй нявестай. Аднойчы дзяўчына падарыла закаханаму паштмайстру свой фотаздымак з надпісам: «На добрую память многоуважаемому Павлу Антоновичу от Фотинии Мочульской. 1906 года, 20 октября, м. Кореличи».

Аднак бацькі дзяўчыны аддалі перавагу не карэліцкаму мешчаніну, а мінскаму пракурору, які належаў да дваранскага саслоўя, за яго і выдалі дачку замуж. Павел Богуш так і не ажаніўся, відаць, не змог забыць сваю каханую. Затое жаданне мець сям'ю і дзяцей пераўвасобілася ў апякунскія клопаты: ён выхоўваў сваіх пляменнікаў.

Аднойчы паважаны паштмайстар наведаў фотаатэлье Я. Калмановіча і праз пэўны час атрымаў на памяць

свой фотапартрэт. Першыя фотамайстэрні пачалі адкрывацца ў Беларусі ў 1860-я гады, якраз тады, калі Павел Богуш з'явіўся на свет. Паступова майстры-фатографы распаўсюдзілі сваю справу не толькі ў Мінску, але і ў невялікіх гарадах і мястэчках. Прыемна ўсведамляць, што вядомы майстар мастацкага фотаздымка Ян Булгак, які захапіўся гэтай справай у пачатку мінулага стагоддзя і адкрыў у Вільні ўласную фотамайстэрню, паходзіў з вёскі Асташын Карэліцкага раёна.

У гэты ж час Калмановіч рабіў фотаздымкі не горш за сталічных прафесіяналаў. Аб гэтым сведчыць фотапартрэт Паўла Богуша, ён добра захаваўся, хаця мінула ўжо больш за стагоддзе. Фотапартрэты ў майстэрні рабіліся ў найлепшых традыцыях таго часу — абавязковым элементам было картоннае паспарту, на якім мацаваўся здымак, упрыгожанае цісненнем з выявай кветак па краях. Пад фотаздымкам — прозвішча майстра і месца стварэння фотапартрэта. На адваротным баку надрукаваны наступны тэкст: «Фотография Я.Л. Калмановича, м. Кореличи, Минской губ.». Кароткі надпіс ніжэй паведамляў, для чаго яшчэ была прызначана фотамайстэрня: «Специальное отделение для увеличения портретов до натуральной величины и фото-эмалиров, брелки, брошки, запонки с фотографиями». Прадукцыя, як бачым, на любы густ.

Пазней Павел Богуш нейкі час працаваў паштмайстарам у Слуцку, аб чым сведчыць разліковая кніжка, па запісах якой можна меркаваць, што з 1911 да 1917 года яе гаспадар захоўваў свае зберажэнні ў Слуцкай дзяржаўнай ашчаднай касе. Потым наш зямляк вярнуўся да сястры Варвары ў Карэлічы, дзе зноў узначаліў мясцовую пошту.

У невялікім мястэчку людзі ведалі адзін аднаго, і Павел Антонавіч, безумоўна, быў добра знаёмы з іншымі прадстаўнікамі мясцовай інтэлігенцыі — настаўнікамі Аляксандрам Дзянькевічам, Сцяпанам і Аляксандрай Рамановічамі. Сябраваў ён і з урачом Лявіцкім. У былым доме Лявіцкіх цяпер месціцца раённы музей. Звесткі пра сям'ю доктара давялося збіраць літаральна па крупінках, знайшліся аматарскія фотаздымкі невядомага аўтара.

Доктар Лявіцкі меў прыватную практыку і лячыў людзей перад вайной і ў час яе. Яго жонка, зубны ўрач, таксама дапамагала хворым людзям. Урачэбныя кабінеты размяшчаліся на першым паверсе дома, на другім жыла сям'я, у іх было двое дзяцей — Янэк і Ганка. Лёс доктара Лявіцкага склаўся трагічна. З успамінаў старажылаў вядома, што, калі ў 1942 годзе яўрэйскае гета ў Карэлічах было ліквідавана, у пустых будынках пасялілі бежанцаў, у якіх пачалася эпідэмія тыфу. Дапамагчы хворым людзям, прычым бясплатна, пагадзіўся толькі доктар Лявіцкі. Для яго гэта высакародная справа закончылася трагічна: ён заразіўся тыфам і памёр.

На фотаздымку адлюстраваны той шчаслівы для Лявіцкіх час, калі ўсе яны яшчэ былі разам. Сур'ёзныя твары бацькоў і цікаўныя вочы дзяцей падкрэсліваюць урачыстасць моманту — не так часта людзі здымаліся ў той час!.. Пахавалі Лявіцкага там жа, дзе і сына Янэка, што незадоўга да гэтага падарваўся на міне, — у Навагрудку, адкуль доктар быў родам. Пасля смерці двух блізкіх людзей жонка разам з дачкой выехала ў Варшаву да сваёй маці. Пра гэтых людзей сёння нагадвае, акрамя фотаздымкаў, толькі іх былы дом.

Святлана КОШУР

■ Радавод

«МАМА МЯНЯЛА ЗОЛАТА НА ХЛЕБ»

Гісторыя адной сям'і

...Мне ўяўлялася, што той час, калі людзей высылалі ў Сібір, калі яны не мелі чаго есці, галадалі, калі прывозілі па адным бервяне, каб збудаваць хату, калі самі ткалі і шылі адзенне, дзесьці вельмі далёка. І хоць я шмат чула пра гэта ад сваёй бабулі, толькі тады, калі села і запісала гісторыю яе жыцця, зразумела, што ўсё гэта... пра нас, пра маю сям'ю.

Цяпер смела магу сказаць, што маё жыццё, шчаслівы лёс выпакутаваны продкамі. Яны імкнуліся жыць, нягледзячы на нягоды, глядзелі ў вочы вайне, перабіваліся хоць нечым падчас голаду ў ссылцы, грэліся на лютых маразах, імкнуліся збудаваць дом і падворак для сям'і, нягледзечы на калектывізацыю. І калі зробленае бурылася ў адзін момант, калі не спраўджваліся мары, яны знаходзілі ў сабе сілы пачаць усё наноў. Дзеля мяне, маіх братоў, нашых дзяцей...

Мая бабуля з саматканымі посцілкамі і ручнікамі, зробленымі разам з прабабуляй.

Нiна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Маю бабулю завуць Ніна Карпук. Яна жыве ў вёсцы Кібуці Брылькоўскага сельскага Савета Валожынскага раёна. Ёй 81 год. Дзядулю звалі Іван. Яго няма ўжо 12 гадоў. Але дзеда я памятаю вельмі добра, бо гэта быў асаблівы чалавек. Сціплы вясковы жыхар, але лідар па жыцці, у сваім асяродку. Умеў рабіць усё — і рабіў гэта сам. Ніколі не прасіў дапамогі, нават у сына і зяця, але яны, вядома, прыязджалі, працавалі плячо ў плячо. Сам жа дзядуля дапамагаў усім. Многія прасілі Ваньку (чамусьці так яго звалі ў вёсцы), і ён ніколі не адмаўляўся: узараць чужое поле, прывесці сена, сплесці кошык ці адрамантаваць гачку. Дапамагаў весці гаспадарку сястры, якая засталася без мужа. І пра сваё дбаў, вядома ж.

Калі заканчваліся сезонныя працы на падворку і ў полі, ён адразу выпраўляўся ў лес. Звычайна выходзіў у пяць раніцы, напаіўшы і навязаўшы каня. Часам і нас браў з сабою — «паглядзець норы лісічак». І мы ішлі праз увесь лес і нарэшце прыходзілі да сваёй узнагароды — бачылі паглыбленую пясчаную пляцоўку, а вакол яе — шматлікія норы. Мы раскладвалі невялікі касцёр у лесе, смажылі на ім сала і хлеб. А шкуркі ад яго «пакідалі лісічкам».

Грыбоў у доме заўсёды было цэлае мора. Іх сушылі, марынавалі, замарожвалі. Бабуля кошыкамі вазіла іх да нас, у горад, і часам сварылася на дзеда, што так шмат грыбоў, што няма калі іх парадкаваць. Калі надавалася вольная часіна, ён запрагаў каня ў калёсы ці сані і выпраўляўся ў лес па дровы. Дома ўсё акуратна рэзаў, калоў, складваў. Будаваў дадатковыя навесы, паветкі, каб яшчэ больш скласці дроў (таксама сена) і каб яны не намоклі. Пасля смерці дзеда запасу дроў, зробленага ім, хапіла яшчэ гадоў на пяць...

...Калі я была меншая, падлеткам, а дзядулі ўжо не стала, задумваючыся, ці правільна паступаю, я заўсёды думала, што ён з неба глядзіць на мяне... Гэта быў галоўны стымул сумленна жыць і рабіць правільныя ўчынкі. У тым, што ён на небе, у мяне сумненняў не было ніколі...

Бабуля і цяпер побач, радуе мяне. Яна добры сябар, які мае народную мудрасць, гаворыць па-беларуску (акрамя таго, што «нахапала» з тэлевізара), заўсёды чакае мяне. А я для яе — любімая, адзіная ўнучка (усе астатнія — хлопцы) і таксама сябар.

Пра тое, што гісторыя маёй сям'і — гэта гісторыя ўсяго народа, сведчыць, напрыклад, той факт, што неяк у вёску прыязджалі музейшчыкі і тканыя посцілкі, некаторыя іншыя прадметы хатняга ўжытку з нашай хаты хацелі забраць у свае фонды.

Шлюбнае фота Ніны і Івана Карпукоў.

Расказвае мая бабуля Ніна Карпук (дарэчы, мяне назвалі менавіта ў яе гонар):

«Трохі пачала адпачываць, як сына нарадзіла: калі гадавала, не чапалі, каб ішла на працу ў калгас. Толькі тады пачала вышываць, а гэтага мне вельмі хацелася! Некалькі карцін, са складанымі ўзорамі, вышыла пакуль гадавала малых дзяцей».

ПРА РАСКУЛАЧВАННЕ

«Майго папку (звалі Антон Ляўковіч) раскулачылі і вывезлі з радзімы разам з сям'ёй за тое, што працаваў лесніком. Забралі каня, дзве каровы. Дома застаўся зруб недабудаванай хаты і зямля, якую бацькі набывалі, каб будавацца. А нас вывезлі туды, дзе вялікія маразы, — у Іркуцк (Сібір). Думалі, што мы тамака прападзём, дадзімся...

Нас мама (звалі Барбара) везла чатырох, і ўсе мы былі малыя. Мне было толькі 4 гадзікі, меншаму брату — 1 год, старэйшаму — 7 гадоў.

Раскулачылі і вывезлі, бо папка быў лесніком: цяпер таксама леснікі ёсць і начальства ёсць, але ніхто нікога не судзіць. Тады нас Сталін вывозіў.

Прабылі ў Расіі 4 гады, вайны там не бачылі, але голаду нахапаліся.

Наша вёска ў Беларусі на той час уваходзіла ў склад Польшчы. Дык польскі пасол дапамагаў: дасылалі ў Сібір коўдры, чаравікі. Даўней усе насілі лапці, але мы мелі чаравікі. А з коўдраў нам шылі пальцішкі — трэба ж было нешта апранаць, бо куртак у тыя часы не было.

Тады на Беларусі хадзіла золата: мама расказвала, што здала парсюка, дык ёй заплацілі адным золатам. Яна ўзяла яго з сабой у Расію і мяняла там на хлеб, каб пракарміць сям'ю.

Старэйшы брат, Янак звалі, захварэў і памёр. А трое нас, дзетак, вярнулася на радзіму. Калі скончылася вайна, можна было ехаць куды заўгодна, у любую краіну. Некаторыя паехалі ў Амерыку. А мая мама сказала, што хоча вярнуцца дадому. Так мы зноў прыехалі ў сваю вёску. Тут зруб ад нашай хаты разабралі, застаўся толькі хлеў. Дык у тым хляве мы выразалі два акны і жылі, пакуль пабудавалі хату.

Барбара Ляўковіч каля сваёй пуні.

Сталі дзеўкамі, пачалі сватацца жаніхі. Да мяне са сваёй вёскі прыйшоў. Я спадабалася яго маці — яна бачыла мяне на вуліцы, я заўсёды віталася. Ён ужо адслужыў тры гады ў войску, ніякіх лістоў адтуль не пісаў. А як вярнуўся, пайшоў у сваты. Прыглядаліся і іншыя кавалеры, але мне яны не падабаліся з-за малога росту. А твой дзед быў высокі.

Дарэчы, мая мама, каб выйсці замуж за папку, выскачыла да яго праз акно. Яе не хацелі аддаваць, бо ён быў бедным. Раней жа таксама выбіралі, хацелі багатага: а чаго багаты — каб зямлі многа было, тады добры жаніх.

Даўней усе вянчаліся — закон такі быў.

Паставіш кросны. Трэба было знаць, як укінуць лён, тады нагамі паціскаеш педалі, закладаеш чаўнок, падбіваеш і тчэш. Хапала працы. А часам сядзіш і прадзеш на калаўроце — матаеш ніткі.

ПРА ШЛЮБ

Я расла, стала падлеткам. Летам мы гойдаліся на арэлях. Зімой хадзілі на сажалку і рабілі сабе забаўку. Убівалі ў лёд колік, чаплялі на яго кола (ад воза), збоку прымацоўвалі палку, каб круціць. Да палкі чаплялі санкі — і так каталіся на санках па лёдзе. Вельмі весела было.

ПРА БУДАЎНІЦТВА ХАТЫ

Калі пачалі арганізоўваць калгасы, то ў людзей забіралі пуні, каб будаваць вялізныя амбары, у якіх захоўвалі калгаснае дабро (збожжа), лён. У нашай вёсцы таксама адбудавалі такі. Дык нехта яго наўмысна падпаліў, і ён згарэў з усім, што было ўнутры, з лёнам. Відаць, нечую забралі пуню, а людзі вось як, падумалі: «Забралі ад нас. Дык няхай лепей ідзе да Бога».

У бацькоў твайго дзеда пуню не забралі (быць можа, калі ў ёй стаялі свінні ці каровы, то тады не забіралі). Маці пуню падзяліла паміж ім і яшчэ трыма братамі і сёстрамі. Кожны атрымаў па сцяне. Мой адкупіў і братаву долю. І пачалі будаваць сваю хату. Ён працаваў цэлы дзень у калгасе, але перад гэтым раненька ўставаў і прыцягваў трактарам з лесу па адным бервяне. Потым часаў, шаляваў яго, сам складваў сцены.

Спачатку збудавалі кухню. У ёй была печка, дык мы накрылі яе дошкамі і спалі, бо ложка яшчэ не мелі. Самі ездзілі па пілавінне, каб пасыпаць яго на столь, уцяпліць хату. Усе вокны, дзверы мой таксама зрабіў сам.

ПРА РАМЁСТВЫ

У мамы было некалькі братоў і сясцёр — Ярыня (Ірына), Лявон (Леанід), Янка і Антось. Янка ўсё казаў на мяне: «Гэта Зэнэлька, яна падобна на Зэнэльку» (іх маці звалі Зінаіда).

Сітуацыю ў Кіеве ўжо параўноўваюць з афінскім крызісам. «Мы не Грэцыя, — пераканана міністр фінансаў краіны Наталля Ярэська. — Я рада, што ў нас зусім іншая сітуацыя. У Грэцыі шмат што звязана з іх нежаданнем пайсці на рэформы». Міністэрства фінансаў Украіны накіравала абноўленую прапанову па рэструктурызацыі абавязацельства спецыяльнаму камітэту крэдыторaў. Гэтая тэма абмяркоўвалася ўчора ў Лондане.

ЛАСКАВА ЗАПРАШАЮЦЬ

Яшчэ адзін відавочны рэсурс для Кіева — прыватызацыя. «Мы думаем пачаць працэс прыватызацыі. Калі амерыканскія інвестары прымуць рашэнне ўкладваць грошы ва ўкраінскія дзяржаўныя кампаніі, то мы хочам іх прадаць на самых празрыстых умовах і бачыць амерыканскіх уласнікаў на тэрыторыі Украіны», — заявіў Арсеній Яцэнюк.

На думку саветніка старшыні прэзідыума Асацыяцыі маладых прадпрымальнікаў Расіі Дзяніса Расамахіна, украінскія актывы прыцягнуць інвестараў. Кіеў, хутчэй за ўсё, створыць добрыя ўмовы для замежнікаў, каб выручыць як мага больш сродкаў. Падобная цікавасць інвестараў да куплі добрых актываў (асабліва дзяржактываў) па параўнальна невысокай цане і з таннай працоўнай сілай заўсёды назіраецца ў крызісныя моманты, тлумачыць Дзяніс Расамахін. На Украіне падобнае было ў 1990-х і ў 2007-2008 гадах. Для амерыканскіх ды многіх еўрапейскіх бізнесменаў ужо стала характэрным размяшчаць свае вытворчасці (небяспечныя, найбольш неэкалагічныя — напрыклад, сховішчы адходаў і да т. п.) у эканамічна праблемных краінах, што дазваляе значна скараціць выдаткі дзейнасці і абысці розныя забароны, якія дзейнічаюць у ЗША і ЕС (узяць хоць экалагічныя забароны). Пры гэтым такім фундатарам можна не асцерагацца, што ўлады краіны будуць іх ушчамляць ці заўзята сачыць за выкананнем законаў.

Украінскія дзяржаўныя кампаніі дакладна знойдуць свайго замежнага пакупніка, згаджаецца і аналітык IFC Markets Зміцер Лукашоў. Найболей цікавымі для замежных інвестараў ва Украіне, на думку эксперта, будуць украінскія дзяржпрадпрыемствы, што маюць перспектыўную нерухомасць для перапрафілявання ў гандлёвыя ці жылыя памяшканні. То бок змешчаныя ў буйных гарадах і курортных зонах.

НІЧОГА ДОБРАГА

Міністр фінансаў Украіны сцвярджае, што эфект ад рэформаў жыхары краіны змогуць адчуць не раней, чым праз год. «Калі простыя ўкраінцы кажуць, што не бачаць вынікаў гэтых рэформаў, нельга сказаць, што гэта няпраўда. Але гэта не з'яўляецца нечаканасцю. Вынік рэформаў будзе адчувальным для іх кашалькоў праз шэсць, дзевяць ці дванаццаць месяцаў», — кажа Наталля Ярэська. Праўда, шэраг экспертаў у якасці тэрміну для поўнага аднаўлення эканомікі называюць і дзесяць, і нават дваццаць (як цяперашні губернатар Адэсы Міхаіл Саакашвілі) гадоў. Але для многіх і тры месяцы — доўгі тэрмін.

І напрыканцы зноў цытата з рэпартажа карэспандэнта BBC. Адна з яго суразмоўцаў — Юлія Нагіна, якая ўзначальвае кіеўскую кампанію па вырабе араматызаванага жэлаціну. З-за эканамічных праблем попыт на асобныя віды яе прадукцыі зменшыўся на 70%, некаторыя свае тавары яна зусім не можа зараз прадаць. «Мы спадзяёмся, што ўсе гэтыя скокі, усе гэтыя пераплёты ўсё ж будуць да лепшага. Але я не задаволена, таму што ў краіне вайна, у эканоміцы разруха, — заўважае Юлія. — Пакуль нічога добрага няма».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
litvinov@zviazda.by

ДЭМАГРАФІЧНЫ РАСКЛАД

Да канца XXI стагоддзя колькасць жыхароў планеты можа ўзрасці да 16,6 млрд чалавек

ААН апублікавала чарговы дэмаграфічны прагноз планеты. Галоўная выснова: нягледзячы на запаволенне тэмпаў росту насельніцтва Зямлі, якое адзначаецца апошнім часам, няўхільна яго павелічэнне да сярэдзіны стагоддзя да 10 мільярдаў чалавек. Самай шматнаселенай краінай планеты ўжо ў 2030-х стане Індыя.

9 КРОПАК РОСТУ

«Гэта адбудзецца на 6 гадоў раней, чым прагназавалася дагэтуль», — сцвярджаецца ў дакладзе дэпартамента па сацыяльна-эканамічных пытаннях ААН. Цяпер у Кітаі і Індыі жыве 1,38 і 1,31 млрд чалавек адпаведна. Насельніцтва дзвюх краін дасягне 1,4 млрд чалавек да 2022 года. Да пачатку 2030-х гадоў (цягам прыкладна дзесяцігоддзя) колькасць жыхароў Індыі будзе працягваць расці, а Кітая стабілізуецца. У выніку ўжо ў 2033—2035 гадах менавіта Індыя стане самай шматнаселенай краінай нашай планеты. Чакаецца, што яе насельніцтва дасягне 1,7 млрд чалавек да 2050-га.

На пачатку трэцяга тысячагоддзя колькасць жыхароў планеты павялічвалася на 1,24% штогод. Цяпер тэмпы росту замарудзіліся да 1,18% — прыблізна 83 млн чалавек. Увогуле ж, гэты паказчык дасягнуў максімуму ў 60-я гады мінулага стагоддзя, а з 1970-х гадоў увесь час змяншаецца.

Цяпер колькасць насельніцтва Зямлі складае 7,3 млрд чалавек. Гэта на 1 млрд больш, чым у 2003-м, і на 2 млрд чалавек перавышае паказчык 1990 года. Паводле новага прагнозу, да сярэдзіны стагоддзя зямлян пабольшае амаль да 10 млрд. Ільвіная доля прыросту прыпадае на краіны з высокім узроўнем нараджальнасці, размешчаныя, галоўным чынам, у Афрыцы, і на шматнаселеныя краіны. 10 самых шматнаселеных краін у свеце знаходзяцца ў Афрыцы (Нігерыя, Эфіопія, Егіпет, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Танзанія, Паўночна-Афрыканская Рэспубліка, Кенія, Алжыр, Уганда, Судан), пяць — у Азіі (Бангладэш, Кітай, Індыя, Інданезія і Пакістан), дзве — у Лацінскай Амерыцы (Бразілія і Мексіка), па адной — у Паўночнай Амерыцы (ЗША) і ў Еўропе (Расія).

Як сцвярджаюць эксперты ААН, больш за палову прыросту насельніцтва планеты ў 2015—2050 гадах забяспечаць 9 краін: Індыя, Нігерыя, Пакістан, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Эфіопія, Танзанія, ЗША, Інданезія і Уганда.

«Павелічэнне колькасці жыхароў да 2050 года адбудзецца нават у тым выпадку, калі паскорыцца зніжэнне ўзроўню нараджальнасці, — адзначаецца ў прагнозе ААН. — З 80-працэнтнай верагоднасцю можна прадказваць, што насельніцтва планеты дасягне 8,4-8,6 млрд чалавек да 2030 года, 9,4-10 млрд — да 2050-га і 10-12,5 млрд — да 2100 года».

Чакаецца, што да сярэдзіны XXI стагоддзя насельніцтва кожнай з шасці краін — КНР, Індыі, Інданезіі, Нігерыі, Пакістана і ЗША — будзе перавышаць 300 млн чалавек. Да гэтага часу Нігерыя апярэдзіць ЗША і стане трэцяй па колькасці насельніцтва краінай планеты.

АФРЫКА З «ПЛЮСАМ»...

Калі сённяшнія тэндэнцыі ў дынаміцы ўзроўню нараджальнасці захаваюцца, то Афрыка, у якой знаходзяцца 27 з 48 найменш развітых краін планеты, будзе адзіным кантынентам, у якім колькасць насельніцтва працягне істотна расці пасля 2050 года. Доля насельніцтва ў агульнай колькасці жыхароў Зямлі ў сярэдзіне стагоддзя дасягне 25%, а да 2100 года — 39%. У XXI стагоддзі Афрыку чакае самы сапраўдны дэмаграфічны выбух. Яе насельніцтва, як лічаць эксперты ААН, да 2100 года павялічыцца ў 4 разы. У 10 афрыканскіх краінах (у тым ліку ў Анголе, Самалі, Угандзе, Танзаніі) праз 85 гадоў жыхароў пабольшае не менш чым у 5 разоў. Рэкардсменам па прыросце насельніцтва не толькі на Чорным кантыненце, але і на ўсёй планеце будзе Нігер. У гэтай цэнтральнаафрыканскай краіне, насельніцтва якой цяпер складае 17,5 мільёна чалавек, да 2100 года будзе жыць, па прагнозах, прыкладна ў 10 разоў людзей больш!

Разам з колькасцю насельніцтва няўхільна расце і працягласць жыцця: з 67 гадоў у 2000—2005 гадах да 70 — у 2010—2015. Гэтая тэндэнцыя прадоўжыцца. Працягласць жыцця дасягне 77 гадоў да 2045—2050 гадоў і 83 — да 2095—2100. Да канца XXI стагоддзя, робяць прагноз аўтары даследавання, працягласць жыцця афрыканцаў вырасце амаль на 19 гадоў — прыкладна да 60 гадоў. Гэты прагноз спраўдзіцца, калі на Чорным кантыненце працягнецца барацьба са СНІДам і іншымі хваробамі.

Зніжэнне ўзроўню нараджальнасці і павелічэнне працягласці жыцця прывядуць да далейшага росту колькасці пажылых людзей. Да 2030 года яна, паводле прагнозу, павялічыцца да 1,4 мільярда чалавек, да 2050-га — да 2,1 млрд, да канца стагоддзя — да 3,2 млрд. У Еўропе да сярэдзіны XXI стагоддзя больш за 60 гадоў будзе кожны трэці — 34%. Цяпер пажылых еўрапейцаў — чвэрць (24%).

...А СТАРЫ СВЕТ З «МІНУСАМ»

Як заўважыў **дырэктар аддзела народанасельніцтва Дэпартамента па эканамічных і сацыяльных пытаннях ААН Джон ВІЛМАТ**, важным аспектам дэмаграфічных змен з'яўляецца міграцыя. У асноўным перасяленцы рухаюцца з рэгіёнаў з нізкім і сярэднім прыбыткам і больш высокай нараджальнасцю ў краіны з высокім узроўнем прыбытку.

Увогуле ж, сярод адметнасцей дэмаграфічнага развіцця спецыялісты адзначаюць розную дынаміку змены насельніцтва розных краін. Напрыклад, цяпер у Пакістане і Германіі прыкладна аднолькавая шчыльнасць жыхароў — 232 і 245 чалавек на 1 кв. км адпаведна. Аднак да канца стагоддзя гэтыя дзяржавы разыдуцца ў процілеглых дэмаграфічных кірунках. Колькасць жыхароў ФРГ зменшыцца прыкладна на чвэрць (з сённяшніх 88 млн да 63 млн чалавек), а Пакістана — падвоіцца.

Дарэчы, такая ж доля, як і Германію, чакае ўсе еўрапейскія краіны. Стары Свет стане адзіным кантынентам, насельніцтва якога праз 85 гадоў не вырасце, а скароціцца — з 738 да 646 млн чалавек. Цікава, што вялікая частка страт прыпадае на Усходнюю Еўропу, дзе ў 10 краінах да сярэдзіны стагоддзя змяншэнне народанасельніцтва перавысіць 15%. У Балгарыі, напрыклад, у 2050 годзе колькасць жыхароў скароціцца на 28%, а яшчэ праз паўстагоддзя — на 52%.

У краінах Усходняй Еўропы гэтак жа, як на захадзе кантынента, нізкі ўзровень нараджальнасці, але ў іх не адбываецца папаўненне насельніцтва за кошт мігрантаў. Гэтыя краіны ў адрозненне ад захаду і поўначы асаблівай папулярнасцю ў выхадцаў з Азіі і Афрыкі не карыстаюцца.

Будзе скарачацца насельніцтва і на ўсходзе Азіі. У Японіі замест 127 млн праз 85 гадоў будуць жыць толькі 83 млн чалавек.

Рэкардсменам па прыросце жыхароў стане Нігер.

Нягледзячы на зніжэнне насельніцтва на ўсходзе, увогуле на кантыненце яно вырасце. А вось доля Азіі ў агульнай колькасці жыхароў Зямлі пры гэтым зменшыцца да сярэдзіны XX стагоддзя да 54%, а да яго канца — да 44%.

Усяго ж на планеце ў 2100 годзе будзе жыць прыкладна 11,2 млрд чалавек. Гэта сярэдні (па ўзроўні нараджальнасці) варыянт змянення колькасці насельніцтва Зямлі. Паводле максімальнага прагнозу, зямлян праз 85 гадоў будзе 16,6 млрд. Прычым заўважная частка насельніцтва планеты будзе прыпадаць менавіта на Індыю.

ІНДЫЯ ПАБУДУЕ «РАЗУМНЫЯ» ГАРАДЫ

Зразумела, улады самай шматнаселенай краіны планеты павінны ўлічваць дэмаграфічныя прагнозы.

Для таго каб размясціць насельніцтва, Індыя павінна штогод прырастаць на Мумбай.

Пэўныя захады робяцца ўжо зараз. Урад Індыі абвясціў пра планы па ўзвядзенні з нуля каля 100 высокатэхналагічных гарадоў. Гэта дапаможа вырашыць найбольш вострыя сацыяльныя праблемы краіны і дасць прытулак насельніцтву, якое імкліва павялічваецца.

Чуючы словазлучэнне «індыйскія гарады», многія звычайна ўяўляюць перанаселеныя, шумныя і брудныя мегаполісы, акружаныя трушчобамі. Аднак, магчыма, хутка такое ўяўленне радыкальна зменіцца. Як адзначыў прэм'ер-міністр краіны Нарэндра Модзі, у планах — пабудаваць у Індыі каля 100 «разумных» гарадоў, створаных па апошнім слове тэхнікі, якія забяспечаць жыхарам самыя сучасныя камунікацыі.

«У мінулым гарады будавалі па берагах рэк, сёння — уздоўж дарог, але ў будучыні выбар месцазнаходжання будзе залежаць ад даступнасці оптавалаконных сетак і інфраструктуры новага пакалення», — заўважае Нарэндра Модзі. Па яго словах, «разумныя» гарады стануць стымулам для развіцця Індыі, якая цяпер застаецца пераважна аграрнай краінай, дзе ў кожнай пятай хатняй гаспадарцы дасюль няма нават стабільнага электразабеспячэння.

Зразумела, ідэя развіцця «разумных» гарадоў не ўзнікла на роўным месцы — прыкладам тут стала новая стадыя ўрбанізацыі ў Кітаі. КНР збіраецца выдаткаваць на ўладкаванне гіганцкіх гарадоў значныя сродкі... Нарэндра Модзі часта ўзгадвае магутнага паўночнага суседа як прыклад краіны, дзе ўдала вырашаюцца праблемы, выкліканыя індустрыялізацыяй. У найбліжэйшай перспектыве ўрад Індыі збіраецца ўкласці ў гарады будучыні каля 1,2 мільярда долараў — вялікую частку гэтых грашовых рэсурсаў разлічваюць прыцягнуць ад прыватных, у тым ліку замежных, інвестараў.

Грандыёзныя планы, зразумела, могуць выклікаць сумненні: маўляў, гэта толькі гучны слоган, патрэбны для таго, каб прадэманстраваць, што новае кіраўніцтва краіны збіраецца эфектыўна вырашаць застарэлыя праблемы індыйскага грамадства. Аднак варта мець на ўвазе тое, што праекты асобных «разумных» гарадоў (у прыватнасці, у штаце Гуджарат, дзе сярэдні клас шматлікі і добра развіты) ужо знаходзяцца ў дэтальнай распрацоўцы. Такія населеныя пункты павінны таксама густа пакрыць прастору паміж Дэлі і Мумбаі (да 1995 года — Бамбей), дзе назіраецца самы высокі ў краіне ўзровень развіцця бізнесу. Увогуле плануецца пакрыць імі тэрыторыю 6 штатаў.

Адзін з топ-менеджараў IBM Ракеш Шарма, чые словы цытуе CNN, кажа, што «разумныя» гарады сапраўды маглі б сур'ёзна падняць узровень жыцця ў Індыі. Напрыклад: інтэлектуальныя сістэмы кіравання дарожным транспартам дапамаглі б справіцца з аўтамабільнымі пробкамі і забруджаннем паветра, сістэмы кантролю водазабеспячэння — зменшыць верагоднасць эпідэмій, камп'ютарны маніторынг электрасетак — забяспечыць бесперабойную падачу энергіі ў жылыя дамы і на прадпрыемствы. «Мы зможам супрацьстаяць праблемам, з якімі цяпер сутыкаюцца гарады, і эфектыўна вырашаць іх», — перакананы Ракеш Шарма.

Колькасць жыхароў Індыі, паводле прагнозаў кансалтынгавай кампаніі McKinsey and Company, да 2030 года дасягне 1 млрд 590 млн чалавек. Каб гэтае насельніцтва магло жыць камфортна, штогод краіна павінна прырастаць па гарадскіх тэрыторыях на агульную плошчу, прыкладна роўную памерам горада Мумбаі (плошча 603 кв. км, разам са спадарожнікамі насельніцтва складае 21,3 млн чалавек). Аднак тэхналагічнае ўдасканаленне цалкам магло б пазбавіць урад ад такой патрэбы. Праз сучаснае планаванне і развіццё гарадоў Індыя магла б з камфортам рассяліць жыхароў, колькасць якіх стабільна павялічваецца, у тых населеных пунктах, якія ёсць зараз.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
litvinov@zviazda.by

Балгарыя — адна з «аўтсайдараў» дэмаграфічнага рэйтынга.

ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит аукцион по продаже земельных участков в собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 10.09.2015 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

№ п/п	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наименование инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)
1.	д. Дашки, участок № 6а, кадастровый номер 623288004101000028	0,1500 га	Подъездные пути удовлетворительные	15 850 800	31 703 000
2.	д. Дашки, участок № 66, кадастровый номер 623288004101000029	0,1497 га	Подъездные пути удовлетворительные	15 819 100	3 163 800
3.	д. Малые Бяседы, ул. Лесная, участок № 11, кадастровый номер 623288009101000039	0,1498 га	Подъездные пути удовлетворительные	17 412 800	3 482 600

Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171100 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится 10.09.2015 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 05.09.2015 г.** (последний день подачи заявления **04.09.2015 г. до 17.00**) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Контактный телефон: (801774) 57 435, 57 499.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-79835 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – здание колбасного цеха), площадью 476,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 14Е. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, площадью 468 кв.м, бетонный бортовой камень, площадью 61 кв.м, трубопровод напорный, протяженностью 328 м.п.
Земельный участок, на котором расположен объект	440100000002001090, (назначение – обслуживание колбасного цеха), площадью 0,1764, расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 14Е
Начальная цена продажи	1 980 000 000 (один миллиард девятьсот восемьдесят миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	198 000 000 (сто девяноста восемь миллионов) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Комплекс зданий и сооружений рынка, расположенного по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 2, в том числе: - капитальное строение, инв. № 401/С-21527 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), площадью 122,3 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2 с принадлежностями: пристройка (38 кв.м), ограждение бетонное (114 кв.м), ограждение бетонное (142 кв.м), ограждение бетонное (37 кв.м), ограждение бетонное (121 кв.м), ворота металлические, калитка металлическая, площадка для мусора (9 кв.м), асфальтированная площадка (551 кв.м), навесы (2 ед. 46 кв.м), навес (45 кв.м), навес (47 кв.м), водопроводная сеть (16 м.п.), электрическая сеть (18 м.п.), электрическая сеть (20 м.п.), ограждение из металлической сетки (27м.п.), ограждение площадки для мусора (4 м.); - капитальное строение, инв. № 401/С-21530 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 26,4 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/1; - капитальное строение, инв. № 401/С-21529 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание павильона «Модуль»), площадью 173,3 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/2; - капитальное строение, инв. № 401/С-21528 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – уборная), площадью 214,0 кв.м. расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/3; - зеленые насаждения
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 42205040000200439, площадью 1,4383 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений рынка)
Начальная цена продажи	2 308 567 870 (два миллиарда триста восемь миллионов пятьсот шестьдесят семь тысяч восемьсот семьдесят) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	230 856 787 (двести тридцать миллионов восемьсот пятьдесят шесть тысяч семьсот восемьдесят семь) белорусских рублей
Условия аукциона	Сохранение целевого назначения выставляемого на аукцион объекта (рынок для торговли сельскохозяйственной продукции, дикорастущими плодами, ягодами и иными продовольственными и непродовольственными товарами, а также животными)
ЛОТ 3	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), обшей площадью 235,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18
Начальная цена продажи	938 106 000 (девятьсот тридцать восемь миллионов сто шесть тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	93 810 600 (девяноста три миллиона восемьсот десять тысяч шестьсот) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 4	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-78076 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 93,1 кв.м, расположенное по адресу Коптевский с/с, д. Каменка, 9А. Составные части и принадлежности: сарай, площадью 27 кв.м, уборная дощатая без выгреба, площадью 1 кв.м.
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422084504601000103, площадью 0,0584 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Коптевский с/с, д. Кменка. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0584 га
Начальная цена продажи	250 000 000 (двести пятьдесят миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	25 000 000 (двадцать пять миллионов) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 5	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-90341 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – здание магазина), обшей площадью 89,0 кв.м, расположенное по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый № 422087505601000080, площадью 0,0366 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0366 га
Начальная цена продажи	100 000 000 (сто миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	10 000 000 (десять миллионов) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 6	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-90341 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 46,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16г
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000001006831, площадью 0,0199 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16г. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, площадью 36 м.кв
Начальная цена продажи	360 000 000 (триста шестьдесят миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	36 000 000 (тридцать шесть миллионов) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 7	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-79015 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание бытовки), площадью 128,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д. Составные части и принадлежности: цементобетонное покрытие, площадью 8, м.кв., ограждение из металлической сетки, протяженностью 48,0 м
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000001006832, площадью 0,0325 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания бытовки), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д
Начальная цена продажи	521 362 000 (пятьсот двадцать один миллион триста шестьдесят две тысячи) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	52 136 200 (пятьдесят два миллиона сто тридцать шесть тысяч двести) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 8	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-67595 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 68,5 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Одельский с/с, д. Радевичи, д. 1а. Составные части и принадлежности: сарай, площадью 32 кв.м
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422086207101000032, площадью 0,3727 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Одельский с/с, д. Радевичи, д. 1а. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью – 0,3727 га
Начальная цена продажи	50 000 000 (пятьдесят миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	5 000 000 (пять миллионов) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230003, г. Гродно, Озерское Шоссе, 41, тел. 74-68-07
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.
Аукцион состоится 26 августа 2015 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.06.2015 г.**	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)	
Последний день приема заявлений – 20 августа 2015 г. до 15.00	

Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта	Право заключения договора аренды помещений сроком 10 лет, общей площадью 337,1 кв.м, расположенных на цокольном этаже здания по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37
Начальная цена продажи	10 113 000 (десять миллионов сто тринадцать тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	коэффициент 2,0
Условия аукциона	Размещение на арендуемых площадях кафе быстрого питания
Сумма задатка	1 011 300 (один миллион одиннадцать тысяч триста) белорусских рублей
ЛОТ 3	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта	Право заключения договора аренды помещений сроком 10 лет, общей площадью 575,0 кв.м, расположенных на первом и втором этажах здания по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37
Начальная цена продажи	17 250 000 (семнадцать миллионов двести пятьдесят) белорусских рублей с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	коэффициент 2,0
Условия аукциона	Размещение на арендуемых площадях ресторана (кафе)
Сумма задатка	1 725 000 (один миллион семьсот двадцать пять тысяч) белорусских рублей
Продавец	УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел.: 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора аренды	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012000046251 в ф-ле № 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 152101752, УНП 500156921, ОКПО 01064077. Получатель – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно
Аукцион состоится 25 августа 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3	
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: - заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; - *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; - *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; - *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: - представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; - физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; - представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).	
Последний день приема заявлений – 19 августа 2015 г. до 15.00.	

Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест № 1»!

Решением внеочередного общего собрания акционеров от 03 августа 2015 года были установлены:

- размер начисленных дивидендов за первое полугодие 2015 года на одну акцию;
- период выплаты дивидендов: до 22 сентября 2015 года;
- следующий порядок выплаты дивидендов:
- на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финотдела администрации Первомайского района;
- акционерам-физическим лицам – через депозитарий ЧУП «Совмедиа» почтовыми переводами.

УНП 100288960

■ Спорт-тайм

БЕЗ УЗНАГАРОД

вярнуліся з казанскага чэмпіянату свету нашы плыўцы

«Правал» беларускіх спартсменаў на чэмпіянаце свету па водных відах спорту, вяртанне Аляксандра Глеба ў БАТЭ і старт хакейнага сезона ў краіне — галоўныя спартыўныя навіны ў традыцыйным штотыднёвым аглядзе «Звязды».

1. Беларускія плыўцы не заваявалі ніводнай узнагароды на чэмпіянаце свету па водных відах спорту, які завяршыўся ў Казані. Больш за тое, усе фіналы спаборніцтваў прайшлі без нашых суайчыннікаў.

Павел Санковіч прымаў удзел у паўфінальным заплыве на дыстанцыі 50 м на спіне, але яго вынік — толькі 10-е месца (25,02 сек.), што не дазволіла адабрацца ў фінал. Да таго ў кваліфікацыі Санковіч абнавіў рэкорд Беларусі, які зараз роўны 24,97 сек. Дарэчы, 10-е месца Паўла на дыстанцыі 50 м на спіне стала найлепшым вынікам беларускіх плыўцоў на сусветным форуме ў Казані. Адзін з лідараў нацыянальнай каманды Яўген Цуркін на сваёй каронай дыстанцыі — 50 м батэрфляем — заняў толькі 11-е месца. У мінулым годзе ў гэтым відзе спаборніцкай праграмы беларус стаў чэмпіёнам Еўропы.

Аляксандра Герасіменя таксама не змагла паказаць сваё найлепшае плаванне ў Казані. На адной са сваіх дыстанцый — 100 м вольным стылем — яна завяршыла барацьбу ў паўфінале, стаўшы 15-й (54,90 сек.). На другой профільнай дыстанцыі — 50 м вольным стылем — Аляксандра абмежавалася ўдзелам у папярэдніх заплывах, заняўшы па іх выніках 18-е месца (25,20 сек.).

— Не самы ўдалы чэмпіянат свету для нашай зборнай, а дакладней правальны. Але гэта не апошняе наша слова, абавязкова зробім работу над памылкамі і пойдзем далей, наперад і толькі наперад! Дзякуй вялікі за падтрымку сябрам і блізкім! І двойчы дзякуй непрыяцелям за іх радасць! Тое, што нас не забівае, робіць нас мацнейшымі! — напісала Герасіменя на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках.

2. Хакейны сезон стартаваў у Беларусі з розыгрышу Кубка краіны (Кубка Руслана Салея), які праходзіць з 7 па 17 жніўня. У турніры прымаюць удзел 12 каманд, якія падзелены на дзве падгрупы згодна з вынікамі рэгулярнага чэмпіянату краіны сезона 2014/2015.

У падгрупе А выступаюць: «Шахцёр» (Салігорск), «Нёман» (Гродна), «Металург-Жлобін», «Хімік-СКА» (Наваполацк), «Ліда» і «Дынама-Бабруйск». **Падгрупу Б** склалі «Гомель», «Юнацтва-Мінск», «Дынама-Маладзечна», «Віцебск», «Брэст» і «Магілёў». Каманды правядуць матчы з сапернікамі па падгрупе ў адзін круг. Клубы, якія зоймуць у сваіх падгрупах 1-е і 2-е месцы, працягнуць барацьбу за ганаровы трафей на другой стадыі.

Напярэдадні старту хакеісты і трэнерскі штаб «Юнацтва-Мінск» ушанавалі памяць славутага спартсмена, капітана нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі Руслана Салея, наведаўшы яго магілу.

3. Тым часам хакейнае мінскае «Дынама» прыняло ўдзел у турніры імя Чарнышова ў Маскве. Нашы хакеісты спачатку выйгралі (3:2, у авертайме) у маскоўскіх дынамаўцаў, потым разгромна саступілі «Спартаку» (0:6), а ў канцоўцы турніру не змаглі адолець хабараўскі «Амур» (2:3).

Апошнім этапам падрыхтоўкі мінскіх «зубраў» да сезона стане Кубак Латвійскай чыгункі ў Рызе. 16 жніўня дынамаўцы згуляюць з рыжскімі аднаклубнікамі, 17 жніўня з яраслаўскім «Лакаматывам», а 19-га сустрэнуцца з казанскім «Ак Барсам». Матч за трэцяе месца і фінал адбудуцца 20 жніўня.

4. Аляксандр Глеб вярнуўся ў барысаўскі БАТЭ. Футбаліст ужо выступаў за «жоўта-сініх» у сезонах 1999-2000 і 2012-2013. З імем Глеба-старэйшага таксама звязаны яркія старонкі жыцця барысаўчан. Сярод іх выступленне БАТЭ ў футбольнай Лізе чэмпіёнаў у 2012 годзе, калі беларускі клуб з удзелам Аляксандра атрымаў перамогі ў групавым турніры над французскім «Лілем» і мюнхенскай «Баварыяй».

— Адчуваю станоўчыя эмоцыі. Як і заўсёды, пры вяртанні дадому. БАТЭ даў мне пуцёўку ў вялікае футбольнае жыццё — і я рады, што магу зноў пастарацца дапамагчы роднаму клубу, які ў гэтым годзе выдатна папрацаваў у Лізе чэмпіёнаў. Застаўся апошні крок. Спадзяюся, разам мы яго зробім, — пракаментаваў сваё вяртанне Аляксандр.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.40	20.49	15.09
Віцебск —	5.25	20.43	15.18
Магілёў —	5.30	20.39	15.09
Гомель —	5.32	20.30	14.58
Гродна —	5.56	21.03	15.07
Брэст —	6.02	20.58	14.56

Месяц

Маладзік 14 жніўня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Астапа, Канстанціна, Кузьмы, Міхала.*
К. *Клары, Луізы, Аляксандра, Уладзіміра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ты ўяўляеш, я скінула 500 кілакалорый за пару секундаў!

— І як жа табе гэта ўдалося?

— Ды выпусціла гамбургер...

Калі сварка не скончылася бурным сексам, то жанчына будзе ўчыняць скандал зноў і зноў, пакуль мужчына не зразумее, у чым сэнс жыцця.

Дзве сяброўкі.

— Мой хлопец даведаўся, што ў мяне ёсць жаніх! Зараз абодва едуць да мяне! Што рабіць?!

— Можа, мужу патэлефанаваць?!

Найлепшы дзень тыдня — серада. Ён роўнааддалены і ад надзей, і ад расчаравання.

— Дарагі, я ўжо гатовая да дзяцей.

— А я не!

— А ўжо нічога не зробіш!

Адэскі дворык, дзве кабеты:

— Ніяк не магу прывучыць Фіму да парадку — кожны раз ён такі хавае кашалёк у новае месца...

caricatura.ru

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

Бяссонніца. У народным асяроддзі лічылі, што чалавек мог пазбавіцца сну, таму што з хаты сышоў добры яе дух — Дамавік, а замест яго пасяліліся нячысцікі жаночага роду: Начніцы, Паўночніцы, Шчакаціхі, Будзіхі і г.д.

Каб дапамагчы чалавеку, які знямог ад бяссонніцы, народныя лекары раілі:

- не класціся спаць без малітвы і не перахрысціўшыся;
- пад падушку ці ў калыску дзіцяці пакласці асвячоную ў храме на Тройцу зеляніну;
- у вушакі дзвярэй утыкнуць галінкі асвячонай вярбы;
- абкурыць ложак кменам або кропам;
- адным з эфектыўных сродкаў ад бяссонніцы лічылі падушку, набітую курыным пер'ем, сабраным з чужых падворкаў.

Каб не вызваць гэтую хваробу і ў сталага, і ў малога:

- не качалі пустую калыску;
- не пакідалі на ноч на дварэ мокрыя пялёнкі ці адзенне, каб іх не «засвяціў» месяц;
- не аддавалі пасля заходу сонца хлебную лапату і жар са сваёй печы, г. зн. не «перадалі» сон са сваёй хаты;
- ваду, якая засталася пасля купання дзіцяці, вылівалі на двор раніцай, а не пасля захаду сонца (яе трэба выліваць пад пладаносныя дрэвы: пасля купання хлопчыка — пад яблыню, пасля купання дзяўчынкі — пад вішню або грушу).
- Яшчэ два правілы традыцыйнай культуры. Па-першае, ложак павінен быў стаяць так, каб на яго ніколі не свяціў месяц. У адваротным выпадку вокны завешвалі занавескамі або закрывалі на ноч аканіцы. Па-другое, каб лёгка заснуць і лёгка прачнуцца, галава падчас сну павінна быць сарыентавана на ўсход. Згадайце: памерлага чалавека хавалі галавой на захад.

Даты. Падзеі. Людзі

11 ЖНІЎНЯ

1794 год — нарадзіўся (маёнтак Цярэспаль Віцебскага павета) Міхаіл Балінскі, гісторык, публіцыст. У 1818 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. Працяглы час з'яўляўся супрацоўнікам часопіса «Віленскі дзённік». У 1818—1822 гадах — сакратар Віленскага друкаванага таварыства. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1830—1831 гадоў, з'яўляўся членам Віленскага цэнтральнага паўстанцкага камітэта. З 1836-га жыў у Варшаве, адзін з заснавальнікаў навукова-літаратурнага часопіса «Варшаўская бібліятэка». З 1847 года — у Вільні, віцэ-старшыня Віленскай археалагічнай камісіі, член Рускага геаграфічнага таварыства. Аўтар публіцыстычных, гістарычных і гісторыка-геаграфічных даследаванняў, прысвечаных Беларусі і Літве. Перакладаў з італьянскай, лацінскай моў. Памёр у 1864 годзе.

1973 год — па Цэнтральным тэлебачанні СССР пачалася дэманстрацыя шматсерыйнага мастацкага фільма «Сямнаццаць імгненняў вясны». У аснове фільма ляжаў сюжэт аднаго з раманаў папулярнага пісьменніка Юліяна Сямёнава — аўтара шматлікіх кніг пра прыгоды савецкага разведчыка Ісаева, які працаваў і пад імем Макса Ота фон Шцірліца. Гэты ўнікальны тэлепраект адбыўся толькі дзякуючы таленту і настойлівасці рэжысёра Таццяны Ліёзнавай.

Не толькі на галоўныя, але нават на эпізадычныя ролі ў гэтым фільме былі запрошаны самыя вядомыя акцёры. У галоўнай ролі выступіў Вячаслаў Ціханаў. Вобраз яго асноўнага сапернікa — шэфа нацысцкай палітычнай паліцыі (гестапа) Мюлера — праславіў ужо немаладога артыста Леаніда Бранявога. У ролях антыфашыстаў, якія дапамагалі Шцірліцу ў яго барацьбе, выступілі Расціслаў Плят (пастар Шлаг) і Яўген Еўсцігнееў. Адзіная буйная жаночая роля ў гэтым фільме дасталася актрысе Кацярыне Градавай. Аднак гледачам запомніліся і эпізадычныя жаночыя вобразы: пышная фрау Заўрых (Эмілія Мільтан), Габі (Святлана Святлічная). Сапраўды народнымі сталі песні Мікаэла Таривердзіева, выкананыя Іосіфам Кабзонам.

1979 год — 17 футбалістаў ташкенцкай каманды «Пахтакор» вылецелі на авіялайнеры «Ту-134» на каляндарны матч чэмпіяната СССР у Мінск на гульню з мясцовым «Дынама». Ім насустрач рухаўся такі жлайнер па маршруце Кішынёў — Варашылаўград — Куйбышаў. На вышыні 7800 метраў адбылося сутыкненне двух самалётаў. З невядомых прычын дыспетчары не дазволілі самалёту з гульцамі «Пахтакора» на борце падняцца на вышыню 9 або 10 тысяч метраў. Праз гэтую жахлівую памылку загінула 178 чалавек, у тым ліку 17 членаў каманды «Пахтакор». Дзяржаўная камісія вызначыла, што вінаватымі ў авіякатастрофе былі два авіядыспетчары з Харкава — іх асудзілі на 15 гадоў пазбаўлення волі. Пасля катастрофы рашэннем федэрацыі футбола СССР на працягу двух гадоў «Пахтакору» было гарантавана месца ў найвышэйшай лізе незалежна ад выступлення каманды.

Было сказана

Максім ТАНК,
народны паэт Беларусі:

Слова без справы —-
Шум ветру толькі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3205.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 жніўня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12